# Абітурыенту-2006

## Гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка

Гістарычны факультэт, адзін са старэйшых у нашым універсітэце, вядзе адлік ад 1923 года. Ён рыхтуе спецыялістаў па трох накірунках: 1) гісторыя і замежная мова (з 1971 г.); 2) гісторыя і сацыяльна-палітычныя дысцыпліны (з 1990 г.); 3) гісторыя і рэлігіязнаўства (з 1997 г.).

Калі ў першы пасляваенны выпуск у 1945 г. дыплом гісторыка атрымалі 13 студэнтаў, то сёння на факультэце налічваецца каля 1000 студэнтаў дзённага аддзялення і каля 500 — завочнага.

На ўсіх спецыяльнасцях асаблівая ўвага надаецца вывучэнню гістарычных прадметаў: сусветнай гісторыі, гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх народаў, археалогіі і іншых дапаможных гістарычных дысцыплін. Студэнты, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Гісторыя і замежная мова», таксама атрымліваюць добрую падрыхтоўку па адной (або дзвюх, калі наведваюць дадатковыя заняткі) з сучасных еўрапейскіх моў. Гэта дае ім права працаваць настаўнікамі замежнай мовы як у звычайных, так і ў спецыялізаваных школах, адкрывае шырокія магчымасці працаўладкавання ў розных галінах народнай гаспадаркі.

Студэнты, якія атрымоўваюць спецыяльнасць «Гісторыя і сацыяльна-палітычныя дысцыпліны», вывучаюць шэраг прадметаў, звязаных з гісторыяй сацыяльна-палітычнай думкі, а па спецыяльнасці «Гісторыя і рэлігіязнаўства» — з гісторыяй рэлігій са старажытнасці да сучаснасці (хрысціянства, іслам, будызм, сінтаізм, нетрадыцыйныя культы і інш.).

Студэнтаў гістарычнага факультэта накіроўваюць на практыку. Пасля першага курса яны выбіраюць археалагічную, музейна-архіўную або этнаграфічную, пасля трэцяга — педагагічную ў летніках Беларусі, Расіі (Краснадарскі край) і Украіны (Крым). На працягу многіх гадоў студэнты гістарычнага факультэта ўдзельнічаюць у раскопках старажытных беларускіх гарадоў — Слуцка, Капыля, Мінска. Кожны год лепшыя з іх выязджаюць на стажыроўкі ў Германію, Англію, Злучаныя Штаты Амерыкі, Францыю і іншыя краіны.

Прафесарска-выкладчыцкі склад гістарычнага факультэта налічвае звыш 100 чалавек. На факультэце працуюць 8 прафесараў і больш за 30 дацэнтаў, якія забяспечваюць высокі ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў. Тысячы выпускнікоў факультэта працуюць не толькі настаўнікамі, але і завучамі і дырэктарамі школ, выкладчыкамі ў ВНУ. Яны карыстаюцца павагай не толькі ў краіне, але і за яе межамі.

Гістарычны факультэт — адзін з лепшых ва ўніверсітэце па паспяховасці, арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў, па іх удзеле ў грамадскім жыцці. Штогод студэнты гістарычнага факультэта бяруць удзел у міжнародных канферэнцыях і форумах. За 2005 год больш за 70 чалавек удзельнічалі ў 12 канферэнцыях не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

На базе гістарычнага факультэта дзейнічаюць шматлікія клубныя фарміраванні, спартыўныя секцыі, каманда КВЗ, «Брэйн-рынг» і танцавальныя калектывы, круглагадовая спартакіяда БДПУ.

У сакавіку 2005 г. на гістарычным факультэце пры падтрымцы ГА «БРСМ» быў створаны ваенна-патрыятычны клуб «Памяць», мэтай якога з'яўляецца далучэнне моладзі да дзейнасці па павышэнні ўласных ведаў, самарэалізацыі і ўдасканаленні ў галіне патрыятычнага, ваеннага і прававога выхавання, актывізацыі пошукавай работы па захаванні памяці аб гераічным мінулым беларускага народа.

Усе асноўныя падзеі вучэбнага, грамадскага і культурна-масавага жыцця факультэта знаходзяць сваё адлюстраванне на старонках факультэцкай газеты «Klio», якую ствараюць студэнты.

12 красавіка 2006 г. на гістарычным факультэце адбудзецца Дзень адчыненых дзвярэй у межах святкавання Дня факультэта.

Дэканат гістарычнага факультэта, студэнцкія арганізацыі гатовыя адказаць на ўсе пытанні, звязаныя з вучобай на факультэце.

Кантактныя тэлефоны: 226-40-25 і 226-40-26; e-mail: hist-fac@bspu.unibel.by

***М. М. Забаўскі,***
*дэкан гістарычнага факультэта*